**Пасланне да Раждзаства Хрыстовага**
**Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі КІРЫЛА**
**архіпастырам, пастырам, манахам і ўсім верным сынам і дочкам**
**Рускай Праваслаўнай Царквы**

**Праасвяшчэнныя архіпастыры,**
**пачэсныя прасвітары і дыяканы, багалюбныя інакі і інакіні,**
**дарагія браты і сёстры!**

Узносячы хвалу ў Троіцы славімаму Богу і падзяляючы з усімі вамі радасць сённяшняй урачыстасці, звяртаюся да вас, праваслаўных сыноў і дачок нашай Царквы, якія пражываюць як у Расіі, так і ў іншых краінах пастырскай адказнасці Маскоўскага Патрыярхата, і сардэчна віншую са святам Раждзаства Хрыстовага — святам увасобленай любові Тварца да Свайго стварэння, святам здзяйснення абяцання аб прышэсці на зямлю Сына Божага, святам надзеі на спасенне і вечнае жыццё.

*Вялікі і славуты цуд здзейсніўся сёння: Дзева нараджае і ўлонне не пашкоджана: Слова ўцялесніваецца і ад Айца не адлучаецца. Ангелы з пастухамі спяваюць славу, і мы з імі ўсклікаем: слава ў вышніх Богу і на зямлі мір* (сціхіра свята). Такімі словамі Царква Хрыстова сведчыць пра таямнічую падзею, якая адбылася звыш двух тысячагоддзяў таму ў Віфлеемскай пячоры і перамяніла ўвесь далейшы ход сусветнай гісторыі. Са здзіўленнем і глыбокай пашанай мы схіляем калені нашых сэрцаў перад гэтай недаступнай чалавечаму розуму таямніцай Божай задумы аб спасенні. З падзякай прымаючы гэты ахвярны дар Тварца і Прамысліцеля, Які пажадаў здзейсніць гэта дзеля нас, *мы вызнаём благадаць, прапаведуем міласэрнасць, не ўтойваем дабрадзеянняў* (малітва вялікай агіясмы).

Што ж нам, хрысціянам XXI стагоддзя, неабходна рабіць, каб далучыцца да гэтага сапраўды неацэннага дабрадзеяння Божага і ўдастоіцца Яго Царства, *угатаванага ад стварэння свету* (Мф. 25, 34)?

Усё, што мы можам і павінны зрабіць у сваім жыцці, — адказаць на Яго любоў узаемнасцю. А гэта азначае — верыць і цалкам давяраць Богу, выконваць евангельскія запаведзі, *ўхіляцца ад зла і рабіць дабро* (Пс. 33, 15), быць, па закліку Спасіцеля, *святлом свету і соллю зямлі* (Мф. 5, 13-14).

Будучы надзеленым свабоднай воляй і неад’емным правам выбару, любы чалавек можа або прыняць Хрыста, або адвергнуць Яго, быць на баку святла — або пагрузіцца ў цемру граху, жыць паводле сумлення — або *паводле стыхій свету* (Кал. 2, 8), праз добрыя справы ствараць у сэрцы сваім рай — або,

наадварот, робячы зло, ужо тут на зямлі цярпець пякельныя мукі. Інакш кажучы, кожны з нас заклікаman да радасці і паўнаты жыцця, або па-просту — да шчасця, а яно, гэта важна ўсведамляць і разумець, немагчыма без Бога, бо Ён — крыніца жыцця і ўсякага дабра, Ён — Тварэц і Прамысліцель, Ён — любячы Айцец, наш клапатлівы Памочнік і Абаронца. Валодаючы свабоднай воляй, чалавек можа выбраць жыццё і дасягнуць падабенства Богу, але ён таксама вольны і ў выбары для сябе іншага, бязбожнага і безблагадатнага жыцця, якое вядзе да пагібелі.

Вось чаму Гасподзь, Які стварыў нас, усё ж не спасае нас без нашага ўдзелу. У спалучэнні *волі Божай, добрай і дасканалай* (Рым. 12, 2), з воляй чалавечай, няхай недасканалай, але якая імкнецца да дабра, — залог нашага паспяховага праходжання зямнога шляху. У канчатковым выніку, вечны лёс кожнага чалавека з’яўляецца працягам таго духоўнага стану, які быў уласцівы яму ў зямным жыцці.

Памятаючы пра гэта, будзем, паводле слова Апостала Паўла, імкнуцца ўзрошчваць у сабе *любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, добрасць, міласэрнасць, веру, лагоднасць, устрыманасць* (Гал. 5, 22-23) і іншыя дары Духу. Будзем рабіць усё магчымае, каб нам заставацца хрысціянамі не толькі паводле назвы, але і паводле ладу жыцця, па адносінах да родных і блізкіх, да супрацоўнікаў і таварышаў па службе, да кожнага чалавека, які мае патрэбу ў нашай дапамозе і саўдзеле, спагадзе і падтрымцы.

Ва ўсе дні, а найперш у гэтае вялікае свята, мы пакліканы старанна маліцца *за мір ўсяго свету і добры стан святых Божых Цэркваў, за хворых, тых, што пакутуюць, паланёных і за спасенне іх*. Значнасць гэтых прашэнняў цяпер вельмі актуальная, бо сілы зла, якія хочуць войнаў і раздзяленняў, апалчыліся на Праваслаўе. Яны сеюць варожасць і нянавісць, выкарыстоўваюць любыя сродкі для здзяйснення сваіх каварных задум. Але мы верым і спадзяёмся, што сілай Божай усе *нямоглыя напады* дэманаў і іх памагатых будуць пасаромлены. Так было не раз у мінулым, так будзе і цяпер. Шматвяковы вопыт Царквы пераконвае нас у гэтым.

Асаблівую падзяку выказваю ўсім, хто, здзяйсняючы цяпер пастырскае служэнне ў межах Украіны, часам з рызыкай для жыцця і здароўя працягвае захоўваць вернасць кананічнаму Праваслаўю, хто бязбоязна ідзе па шляху веравызнання, пераносіць знявагі і пакуты за Хрыста і за Царкву. Такім мужным абаронцам і захавальнікам Ісціны няхай дапаможа Гасподзь у выпрабаваннях і няхай пакуты іх залічыць за праведнасць.

Нягледзячы ні на што, духоўна мы адзіныя. Мы адзіныя, бо выйшлі з адзінай хрысцільнай купелі. Мы адзіныя, бо сукупна яўляем паўнату Адзінай, Святой Саборнай і Апостальскай Царквы. Мы адзіныя, бо з’яднаны непарыўнай повяззю любові ў Хрысце. Мы адзіныя, бо нязменныя словы Спасіцеля: «*Я з вамі ва ўсе дні да сканчэння веку*» (Мф. 28, 20). Таму нам, хрысціянам, няма каго і няма чаго баяцца, пра што і нагадвае апостал Павел, усклікаючы: «*Калі*

*Бог за нас, то хто супраць нас*?» (Рым. 8, 31). Натхняючыся гэтым абяцаннем, мы жывём і здзяйсняем, змагаемся і перамагаем іменем Гасподнім, бо, як піша святы апостал Пётр, «*няма пад небам іншага імя, дадзенага людзям, праз якое належыць нам спасціся»* (Дзеян. 4, 12). Не было, няма і не будзе, — сведчыць Царква.

З часу прышэсця на зямлю Госпада і дасёння ўсім веруючым у Яго даравана магчымасць быць дзецьмі Айца Нябеснага, бо, як сцвярджае святы апостал Павел, цяпер мы *свае, а не чужыя Богу* (Эф. 2, 19). І гэта азначае, што ўсе мы — Яго дзеці, а ў Ім і праз Яго — родныя і блізкія адзін аднаму.

У богаслужэннях і свяшчэннадзействах Царквы, якая з'яўляецца месцам сустрэчы чалавека са сваім Творцам, нам прыадчыняецца заслона вечнасці і ўжо тут, на зямлі, даецца прадчуванне будучай паўнаты быцця, калі, паводле слова Свяшчэннага Пісання *будзе Бог усё ва ўсіх* (1 Кар. 15, 28), калі ніхто і нішто *не зможа адлучыць нас ад любові Божай* (Рым. 8, 39), ад радасці зносін з Ім, калі *ўтрэ Бог кожную слязу з вачэй чалавечых, і смерці ўжо не будзе, бо ранейшае мінула* (Адкр. 21, 4).

Абвяшчаючы людзям добрую вестку аб прыходзе ў свет Спасіцеля, Царква, як дзеталюбная маці, усіх заклікае ўвераваць у Хрыста і жыць па Яго запавету, каб стаць спадкаемцамі вечнага блажэнства. Сапраўды Гасподзь прыйшоў на зямлю, каб нас узвесці на неба. Ён нязменна прапануе людзям ісці шляхам духоўна-маральнага перамянення, якое дасягаецца выкананнем евангельскіх запаведзяў, добраахвотным супрацоўніцтвам чалавека і Бога, садзеяннем Яго благадаці, якая пасылаецца праз Таінствы Царквы.

І калі ва ўзаемаадносінах з людзьмі, у паўсядзённых справах і клопатах мы навучымся кіравацца Божымі ўстанаўленнямі, то многае пераменіцца не толькі ў нас, але і вакол нас: жыццё набудзе сапраўдны сэнс, напоўніцца сапраўднай радасцю і шчасцем..

Дык будзем жа вартымі хрысціянскага звання і паклікання. Будзем ісці па жыццёвым шляху з цвёрдай верай і непахіснай надзеяй на дапамогу звыш, радуючыся кожнаму новаму дню і новай магчымасці рабіць добрыя справы, любячы бліжніх і *дзякуючы заўжды за ўсё Богу* (Эф. 5, 20), Яму ж належыць уся слава, гонар і пакланенне на векі вякоў. Амінь.

Са святам усіх вас, мае дарагія, з Ражджаством Хрыстовым!

ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І ЎСЯЕ РУСІ

*Раджджаство Хрыстова*

*2024/2025 года*

*г. Масква*